ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
А.Л. Вярсоцкі
2018 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю” (далей – выстаўка-конкурс).

2. Арганізатарамі выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

3. Мэтамі і задачамі абласной выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: адраджэнне, захаванне і папулярызацыя вуснай народнай творчасці Гродзеншчыны сродкамі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва праз вобразы казачных герояў, міфічных істот, якія яскрава раскрываюць існасць мясцовых легенд і паданняў; выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі; стварэнне спрыяльных умоў для самарэалізацыі асобы; раскрыццё мастацкага патэнцыялу дзяцей і моладзі ў розных відах і жанрах народнай творчасці; далучэнне дзяцей і моладзі да лепшых узораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; фарміраванне ідэйна-мастацкага ўзроўню і эстэтычнага густу дзяцей і моладзі; прапаганда беларускай нацыянальнай культуры ў дзіцячае і маладзёжнае асяроддзе.

4. Выстаўка-конкурс праводзіцца з 10 красавіка па 1 чэрвеня 2018 года ў ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

5. Для кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем выстаўкі-конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў арганізатараў конкурсу: спецыялістаў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

6. Аргкамітэт разглядае і зацвярджае: план мерапрыемстваў па арганізацыі і правядзенні выстаўкі-конкурсу; склад журы, які фарміруецца з ліку спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва; спіс удзельнікаў; узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку; мае права ўносіць змяненні ў пералік конкурсных намінацый; уносіць на разгляд арганізатараў выстаўкі-конкурсу прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне; вырашае іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенню выстаўкі-конкурсу.

7. У выстаўцы-конкурсе прымаюць удзел удзельнікі гурткоў і студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, вучні дзіцячых мастацкіх школ і школ мастацтваў, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установ, асобныя таленавітыя канкурсанты – прадстаўнікі дзяцей і моладзі вобласці ў дзвюх узроставых катэгорыях: 1) да 16 гадоў; 2) ад 16 да 31 года.

8. Кожны канкурсант можа прадставіць не больш 3 выставачных работ.

9. Для ўдзелу ў конкурсе да 19 сакавіка 2018 года накіроўваюцца заяўкі (не больш 3 ад раёна) па форме (дадаецца) на электронны адрас: ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (onmcnt@tut.by).

10. Даведкі па тэл.: 8 (0152) 74 04 48.

11. Установы культуры, адукацыі ці іншыя арганізацыі якія накіроўваюць канкурсантаў, нясуць камандзіровачныя і транспартныя выдаткі па дастаўцы конкурсных работ і зваротна.

12. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- "жывапіс";
- "графіка";
- "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва".

13. Конкурсныя работы, прадстаўленыя на выстаўку, павінны ўвасабляць вобразы казачных герояў, міфічных істот, яскрава раскрываць існасць мясцовых легенд і паданняў.

14. Работы павінны быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, выкананы акуратна, згодна з тэхналогіямі, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў. Магчыма эксперыментаванне з матэрыяламі.

15. На адваротным баку прадстаўляемых на выстаўку конкурсных работ размяшчаецца тлумачальная запіска, дзе ўказваецца назва работы, прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост аўтара, матэрыялы і тэхніка выканання работы, поўная назва ўстановы, якая прадстаўляе канкурсанта.

16. Вынікі выстаўкі-конкурсу журы падводзіць асобна па кожнай намінацыі ў дзвюх узроставых катэгорыях (п.7. дадзенай інструкцыі).

17. Пераможцы выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) у рамках і прызамі.

18. Журы ўзнагароджвае канкурсантаў таксама 7-ю спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках па натупных намінацыях:

- "за глыбіню вобразнага раскрыцця тэмы";
- "за арыгінальнасць кампазіцыйнага і каляровага рашэння";
- "за пераемнасць народных традыцый";
- "за крэатыўнае мастацкае мысленне";
- "за лепшае мастацкае фота";
- "за лепшую скульптуру";
- "прыз глядацкіх сімпатый".

19. Усе астатнія канкурсанты ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у выстаўцы.

20. Па ўзгадненні з аргкамітэтам журы мае права прысудзіць у адной намінацыі некалькі дыпломаў лаўрэата з адпаведнымі прызамі ў межах выдзеленнага прызавога фонду.

21. Падвядзенне вынікаў і заахвочванне пераможцаў абласной выстаўкі-конкурсу адбудзецца 1 чэрвеня 2018 года ў ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

22. Фінансаванне абласной выстаўкі-конкурсу ажыцяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

23. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, дыпломаў, рамак, расходных матэрыялаў для афармлення выстаўкі.

24. Для фінансавання абласной выскаўкі-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак
да інструкцыі на абласную выстаўку-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гаррайвыканкама

## ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласной выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку________________________________
________________________________________________________
2. Дата нараджэння____________________________________________
3. Пашпартныя дадзеныя (серыя, нумар, калі і кім выдадзены)______
________________________________________________________
4. Месца пражывання, кантактны тэлефон_______________________
________________________________________________________
________________________________________________________
5. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)
________________________________________________________
________________________________________________________
6. Работы, прадстаўленыя на выстаўку-конкурс:

| № п/п | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|
| 1. | | |

***Заўвага:*** *да заяўкі дадаецца фота работ.*